**ДАДАНЫЯ ЧЛЕНЫ СКАЗА** – кампаненты сказа, якія ўваходзяць у групу дзейніка або выказніка, звязваюцца з галоўнымі членамі сказа ці паміж сабой адным з відаў падпарадкавальнай сувязі. Традыцыйна вызначаюць наступныя даданыя члены сказа: дапаўненне, азначэнне, акалічнасць (гл. **ДАПАЎНЕННЕ**, **АЗНАЧЭННЕ**, **АКАЛІЧНАСЦЬ**). Даданыя члены сказа – структурна неабавязковыя кампаненты сказа.

Даданыя члены сказа – паняцце граматычнае, якое звязана выключна са структурным падпарадкаваннем членаў сказа. Адносна сэнсавай значнасці даданыя члены могуць быць вызначальнымі: *Даўно не быў Андрэй Даніліч на радзіме* (С. Грахоўскі); *Восень падкрадвалася заўседы ціха, як котка* (Я. Сіпакоў).

Даданыя члены сказа, якія ўключаюцца ў сказ праз сувязі і адносіны з асобным словам, утвараючы словазлучэнне, называюцца **недэтэрмінаванымі**.

Даданыя члены сказа, якія ўключаюцца ў сказ праз граматычную аснову, далучаючыся да сказа ў цэлым, развіваючы праз структурную схему ўвесь сказ, называюцца **дэтэрмінаванымі (дэтэрмінантамі)**.

**Азначэнні** бываюць:

***недэтэрмінаваныя*** (заўсёды): *Адразу за сядзібай пачынаўся беластволы бярэзнічак* (З. Бандарына); *Не кожны дзень выпадае чалавеку шчасце пахадзіць пад такім цудоўным дажджом* (М. Капыловіч).

**Дапаўненні** могуць быць:

***недэтэрмінаваныя*** – канкрэтызуюць, дапаўняюць значэнне пэўнага слова (як правіла, іншага дапаўнення або аднаго з аднародных выказнікаў): *Шчыра кажучы, не вельмі памятаю ўражанне ад гэтага верша* (Я. Брыль); *Гусі лапаталі крыламі, а ў неба падняцца не маглі* (С. Грахоўскі); *Ягады паспелі ўжо і пазіралі на Юлю засмяглымі чырвонымі вочкамі* (Б. Сачанка);

***дэтэрмінаваныя*** – пашыраюць граматычную аснову сказа самастойна, свабодна, што абумоўлена яго зместам; у ролі дэтэрмінаваных дапаўненняў звычайна выступаюць назоўнікі (займеннікі) у родным склоне з прыназоўнікамі *ад, да, для, у* і інш., а таксама ў давальным склоне: *Да грошай тата не быў прагны* (А. Пальчэўскі); *Мне тады было васямнаццаць год* (В. Гарадзілава).

**Акалічнасці** могуць быць:

***недэтэрмінаваныя*** – акалічнасці меры і ступені, спосабу дзеяння (у асноўным), а таксама некаторыя акалічнасці месца, часу, прычыны і мэты: *Хаты вялізныя, з добрага смалістага бярвення, крытыя найбольш дранкаю, гонтай, а дзе-нідзе і толем, шыферам* (Б. Сачанка); *Хацелася нагбом піць халаднаватае празрыстае паветра, слухаць звонкую цішыню асенніх палёў* (С. Грахоўскі); *Максім саскачыў з воза і спыніўся на мосце* (І. Шамякін); *Старое кола і застаўкі* [*млына*]*... пазелянелі ад часу і многа прапусцілі вады за свой век…* (С. Александровіч); *Лабановіч звярнуў з дарогі і пайшоў агледзаць лес* (Я. Колас);

***дэтэрмінаваныя*** – акалічнасці ўступкі, умовы (у большасці выпадкаў), а таксама некаторыя акалічнасці месца, часу, прычыны і мэты: *Нягледзячы на перашкоды, задуманае здзейснена. Не мазаўшы, не паедзеш* (Прык.); *Не шукаючы, не знойдзеш* (Прык.); *Ён* [*Васіль*], *насуперак сваёй звычайнай насцярожанасці, мог думаць толькі пра шчасце* (І. Мележ); *Навокал бруіцца вясновы звон вады і сонца* (М. Вышынскі). *Упершыню я ехаў на легендарнае возера Нарач* (К. Кірэенка). *Толькі ад непрывычкі выступіў на ілбе пот* (А. Асіпенка); *...Веньямін наважыўся схадзіць у грыбы* (І. Навуменка).

**Табліца**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | **Недэтэрмінаваныя** | **Дэтэрмінаваныя** |
|---|---|---|
| **Азначэнні** | *У белай гушчы бязлікіх вішнёвых кветак да новай раніцы заціх любоўны, заклапочаны пчаліны звон* (Я. Брыль). | |
| **Дапаўненні** | *Толя стаіў дыханне і заціснуў у жмені арэхавы прут вудзільна.* | *Табе, шчодры сялянскі стол, хочацца сказаць ласкавае слова* (Я. Сіпакоў). |
| **Акалічнасці** | ***Месца:*** *Вартавы… завёў нас у лагер, далажыў пра нас камандзіру* (Б. Сачанка).<br><br>***Часу:*** *Месячык ненадоўга спыніўся над полем і хутчэй схаваўся за хмарку.*<br><br>***Прычыны:*** *Дзяўчынка ўбачыла незнаёмага і неспадзеўкі спалохалася.*<br><br>***Мэты:*** *Мой бацька хадзіў у лес рэзаць луцце – трэба было на лапці лыка, − забрыў далёка… там убачыў зямлянкі* (Б. Сачанка).<br><br>***Спосабу дзеяння:*** *Міканор амаль без націску ўсадзіў у твань рыдлёўку, узняў на ёй бліскучую аладку… шмякнуў наводмаш* (І. Мележ).<br><br>***Умовы:*** *Засумаваў у такім выпадку чалавек, потым узбадзёрыўся, акрыяў.*<br><br>***Меры і ступені:*** *Ён* [*Міканор*] *адмераў кожнаму дзялянку.., рынуўся ў рудую з прозеленню твань, уехаў аж па грудзі* (І. Мележ). | ***Месца:*** *Усюды пахла дымам* (І. Пташнікаў).<br><br>***Часу:*** *Выехалі пад вечар* (І. Мележ).<br><br>***Прычыны:*** *Мабыць, ад гэтай цішы, чорнай маўклівасці навокал гаварылі мала* (І. Мележ).<br><br>***Мэты:*** *Мы ідзём фатаграфавацца.*<br><br>***Спосабу дзеяння:*** *Коннік ехаў па пушчы адзін* (Я. Брыль).<br><br>***Умовы:*** *Не ганячы, не купіш, не хвалячы, не прадасі* (Прык.).<br><br>***Уступкі:*** *Нават і зараз, нягледзячы на свае восемдзесят год, дзед Мікіта за пояс маладога заткне* (Я. Колас). |

***Размежаванне даданых членаў сказа*** – дакладнае вызначэнне сінтаксічнай функцыі даданых членаў сказа з улікам разнастайных лексіка-граматычных фактараў. Цяжкасці ў размежаванні выклікаюць немарфалагізаваныя даданыя члены сказа, г.зн. тыя, якія выражаны не тыповай для іх формай. Найчасцей гэта беспрыназоўнікава- і прыназоўнікава-склонавыя формы назоўнікаў, якія ў сказе могуць выконваць функцыі дапаўнення, азначэння (прыдатка), акалічнасці.

Пры размежаванні даданых членаў сказа важна ўлічваць:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**парадак слоў**:

1) залежнае слова з’яўляецца азначэннем, калі знаходзіцца побач з назоўнікамі і ўтварае з ім словазлучэнне: *Лес на другім беразе быў густа падсінены смугой…* (В. Іпатава);
2) залежнае слова з’яўляецца акалічнасцю, калі знаходзіцца побач з дзеясловам і ўтварае з ім словазлучэнне: *Пасярод рыначнай плошчы **стаяла** вялізная драўляная стадола* (С. Грахоўскі);

**суаднесенасць немарфалагізаваных членаў сказа з марфалагізаванымі**: *Дзве глыбока выезджаныя машынамі каляіны вялі ў густы, з чорнай карой сасоннік* (М. Кусянкоў) – немарфалагізаваны член сказа *з чорнай карой* выступае як аднародны член (або як слова, якое ўдакладняе) з марфалагізаваным азначэннем *густы*, таму сам з’яўляецца азначэннем;

**магчымасць замены немарфалагізаванага члена сказа марфалагізаваным**: *На даляглядзе, паміж вясковых сядзіб, узвышаюцца гмахі заводаў* (В. Вольскі) (*завадскія* гмахі); *Праца кожнага будзе заўважана і ацэнена па справядлівасці* (А. Асіпенка) (ацэнена *справядліва*);

**пытанні ад паяснёнага слова да залежнага**:

1) пытанні могуць быць склонавымі і пытаннямі членаў сказа; калі склонавае пытанне супадае з пытаннем члена сказа, то перад намі – дапаўненне: *Вясна не хацела мірыцца* (з чым?) *з упартаю зімою* (В. Карамазаў);
2) калі склонавае пытанне не супадае з пытаннем члена сказа, то перад намі – акалічнасць: *Выбраўшыся з вады, мядзведзь адразу накіраваўся* (у што? куды?) *ў лес і знік* (у чым? дзе?) *у кустах* (В. Вольскі);
3) пытанні павінны быць лагічныя;

**значэнне паяснёнага і залежнага слоў**: *За Галубком нас хадзіла цэлая чарада…* (С.Грахоўскі) – *за Галубком* – дапаўненне, мае аб’ектнае значэнне; *За бродам трапілася вывернутая старадрэвіна…* (Б. Сачанка) – *за бродам* – акалічнасць, мае прасторавае значэнне; *Янка Брыль па-сялянску любіць паглыбіцца ў слова* (А. Сямёнава) – *у слова* – дапаўненне, мае аб’ектнае значэнне. *Зося збіраецца “ў свет”* (Я. Брыль) – *“у свет”* – акалічнасць, мае прасторавае значэнне;

**кантэкст**: *Аналіз Брыля падрабязны і поўны* – кампанент *Брыля* з’яўляецца азначэннем, калі ўжываецца з семантыкай утваральніка (суб’екта) дзеяння; кампанент Брыля з’яўляецца дапаўненнем, калі мае аб’ектнае значэнне “творы Брыля”.

З’яўляюцца ***дапаўненнямі***:

назоўнікі роднага і творнага склонаў, якія адносяцца да аддзеяслоўнага ці адпрыметнікавага назоўнікаў або назоўнікаў, суадносных з дзеясловамі, і абазначаюць аб’ект дзеяння: *Помню сваё першае, ні з чым не параўнанае ўражанне ад вершаў паэта…* (Г. Бураўкін); *Сапраўднае знаёмства з паэзіяй Панчанкі прыйшло пазней* (Я. Брыль).

З’яўляюцца ***азначэннямі***:

1) назоўнікі роднага склону са значэннем прыналежнасці (у шырокім сэнсе слова): *Кніга Брыля настройвае свайго чытача на высокі лад…* (М. Стральцоў); *Тарас ужо другі дзень гуляў вяселле дачкі* (А. Жук).
2) назоўнікі роднага склону са значэннем стваральніка (суб’екта) ці носьбіта прыметы: *Красу птушынага голасу я ведаў, перш за ўсё, ад жаваранка і шпака* (Я. Брыль); *Навокал бруіцца вясновы звон вады і сонца* (М. Вышынскі); *Блакіт неба ажно рэзаў вочы* (І. Шамякін).

З’яўляюцца ***прыдаткамі***:

1) назоўнікі, якія абазначаюць характарыстычную якасць або ўласцівасць: *Дзе знайсці словы, каб коратка расказаць пра сённяшні Мінск – наш гонар, нашу славу, нашу песню!* (Я. Рамановіч); *Нерухомыя елкі ўткнулі ў неба свае доўгія пікі-верхавіны*

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

(М. Дзелянкоўскі); *Я праязджаю тым маршрутам Праз беларускі лес-гушчар…* (А. Александровіч);

2) назоўнікі, якія можна замяніць прыметнікамі: *Блішчаць сенажаці травой-аксамітам* (П. Броўка); *У такі час хочацца думаць. Пра што? Ці не ўсё адно для гэтых прыгажунь-соснаў і гардынь-елак* (С. Кухараў);
3) назоўнікі, якія з'яўляюцца відавой назвай прадмета: *За ноч маладыя механізатары ўзаралі зямлю, удзень выйшлі жанчыны, школьнікі, пасадзілі дрэўцы – таполі і клёны* (Л. Леванові); *Кветку-званочак крані – Песні пальюцца адтуль жаўруковы…* (Р. Барадулін);
4) назоўнікі, якія не дапасаваны да азначэння і не кіруюцца выказнікам: *Стукнецца* [*яснасць*] *у шыбы, у сенцы, укіне свой кліч-закліканне…* (Я. Купала); *Параднюся з палын-цішынёй* (Я. Янішчыц);
5) агульныя назоўнікі, калі ўласныя абазначаюць асобу і не адасабляюцца ў сказе: *У горадзе ўсе звалі яго дзядзькам Раманам…* (В. Хомчанка); *Сачанка-пісьменнік мае багатую, грунтоўную літаратурную школу* (С. Андраюк);
6) уласныя назоўнікі, калі агульныя абазначаюць геаграфічныя аб'екты: *Праехалі вёскі Пяценька, Бярэжкі, Баянаў, Бярозаўка, Зубаравічы* (Ф. Янкоўскі); *Вам даводзілася бачыць Нямігу? Не, не вуліцу – я ўспомніў Нямігу-раку* (М. Лужанін).

З'яўляюцца ***акалічнасцямі***:

назоўнікі ўскосных склонаў, якія адносяцца да аддзеяслоўных назоўнікаў са значэннем дзеяння і абазначаюць месца або накірунак гэтага дзеяння: *Усе іхнія патаемныя выхады ў лес, і чаканне, і радасці – усё засталося лёгка і проста там, за паласою халоднага дажджу* (А. Жук); *Вандроўкі на хутар не дужа вабілі Лабановіча* (Я. Колас).

*М.С.Ржавуцкая*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ